ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад рэктара БДУ
24.08.2011 № 344-ОД

# Правілы
# пражывання ў інтэрнатах для навучэнцаў
# Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

## Глава 1
## Агульныя палажэнні

1. Правілы пражывання ў інтэрнатах навучэнцаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – Правілы пражывання) вызначаюць унутраны распарадак інтэрнатаў для навучэнцаў, прапускны рэжым, правы і абавязкі навучэнцаў, якія пражываюць у інтэрнаце, парадак заахвочвання і прымянення дысцыплінарных спагнанняў і з'яўляюцца абавязковымі для асоб, якія залічаны ва ўстаноўленым парадку ў лік слухачоў, навучэнцаў, студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, дактарантаў, саіскальнікаў, стажораў для навучання ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (у тым ліку залічаных на ўмовах аплаты і мэтавай падрыхтоўкі) і пражываюць у студэнцкіх інтэрнатах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

2. Асобы, якія засяляюцца ў інтэрнат, абавязаныя асабіста прад'явіць загадчыку інтэрната (службовай асобе, якая яго замяшчае) пашпарт, дамову найму жылога памяшкання, медыцынскую даведку.

3. Асобы, якія засяляюцца ў інтэрнат, павінны азнаёміцца з Правіламі пражывання, неабходнымі мерамі бяспекі, прафілактыкі траўматызму, першай медыцынскай дапамогі пры ажыццяўленні самастойных заняткаў фізічнай культурай у пакоях для актыўнага адпачынку Студэнцкага гарадка, прайсці інструктаж па правілах пажарнай бяспекі, азнаёміцца з парадкам засялення, афармлення рэгістрацыі (зняцця з рэгістрацыйнага ўліку) і вызвалення інтэрнатаў. Інструктаж і азнаямленне праводзяцца загадчыкам інтэрната (службовай асобай, якая яго замяшчае). Загадчык інтэрната (службовая асоба, якая яго замяшчае) рэгіструе правядзенне азнаямлення і інструктажоў у адпаведных журналах, асоба, якая засяляецца ў інтэрнат, ставіць аб гэтым подпіс у журнале.

4. Асобе, якая засяляецца ў інтэрнат, прызначаецца адпаведнае жылое памяшканне, даецца ў часовае карыстанне неабходны інвентар і бялізна, пропуск на права ўваходу ў інтэрнат.

5. Асобы, якія пражываюць у інтэрнаце нясуць поўную матэрыяльную адказнасць за шкоду, прычыненую па іх віне маёмасці ўніверсітэта, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6. З 23.00 у інтэрнаце павінна захоўвацца цішыня. У калідорах і месцах агульнага карыстання застаецца дзяжурнае асвятленне.

7. Вызваленне інтэрната ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб студэнцкіх інтэрнатах БДУ, парадкам засялення, афармлення рэгістрацыі (зняцця з рэгістрацыйнага ўліку) і вызвалення інтэрнатаў і дамовай найму жылога памяшкання.

## Глава 2.

Прапускны рэжым

8. Асобы, якія пражываюць у інтэрнаце, могуць беспарашкодна ўваходзіць у інтэрнат з 6.00 да 24.00.

9. Пабочныя асобы дапускаюцца ў інтэрнаты для навучэнцаў штодзённа з 9.00 да 22.00 і не пазней 23.00 абавязаны пакінуць інтэрнат.

10. Падчас экзаменацыйнай сесіі ўваход у інтэрнат дазваляецца толькі слухачам, навучэнцам, студэнтам, магістрантам, аспірантам, дактарантам, саіскальнікам, стажорам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

11. Падчас канікулаў асобам, якія не пражываюць у інтэрнаце, уваход у інтэрнат забаронены.

12. Пры ўваходзе ў інтэрнат пражываючыя асобы абавязаны прад’явіць дзяжурнаму па інтэрнаце пропуск, а наведвальнікі – дакумент, які сведчыць асобу (пашпарт, від на жыхарства), іншыя дакументы, якія дазваляюць ідэнтыфікаваць асобу яго ўладальніка (ваенны білет, вадзіцельскае пасведчанне, службовае пасведчанне, пенсійнае пасведчанне, студэнцкі білет, заліковая кніжка, білет чытача, пропуск на права ўваходу ў інтэрнат БДУ) (далей – дакумент, які сведчыць асобу), і зарэгістравацца ў кнізе ўліку наведвальнікаў.

13. Асоба, якая запрасіла наведвальніка, абавязана сустрэць яго на вахце і пакінуць у дзяжурнага свой пропуск. Пры выхадзе наведвальніка ў кнізе ўліку наведвальнікаў робіцца адзнака аб часе яго сыходу і заўвагі, калі яны ёсць. Пры выхадзе апошняга наведвальніка пражываючая асоба павінна забраць свой пропуск. Асоба, якая запрасіла наведвальніка, нясе поўную адказнасць за яго своечасовы сыход з інтэрната, а таксама за выкананне ім Правіл пражывання.

14. Асобы, якія не маюць пры сабе дакумента, што сведчыць асобу, а таксама грамадзяне, якія знаходзяцца ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап’янення, у інтэрнат не дапускаюцца.

## Глава 3.
## Правы і абавязкі асоб, якія пражываюць у інтэрнаце

15. Асобы, якія пражываюць у інтэрнаце, маюць права:

15.1. карыстацца жылой плошчай, памяшканнямі навучальнага і культурна-бытавога прызначэння, месцамі агульнага карыстання, абсталяваннем, інвентаром інтэрната і дадатковымі платнымі паслугамі;

15.2. патрабаваць своечасовай замены непрыдатнага для выкарыстання абсталявання, мэблі, іншых прадметаў хатняга ўжытку і культурна-бытавога прызначэння (акрамя выпадкаў, калі яны пашкоджаны і выведзены са строю па віне пражываючых асоб, а таксама належнага культурна-бытавога абслугоўвання;

15.3. выбіраць органы самакіравання інтэрната і быць абранымі ў іх склад;

15.4. удзельнічаць у вырашэнні пытанняў удасканалення жыллёва-бытавога забеспячэння, арганізацыі выхаваўчай працы і вольнага часу, абсталявання і афармлення жылых пакояў і памяшканняў;

15.5. удзельнічаць у абмеркаванні і вырашэнні ўсіх пытанняў, якія тычацца жыцця асоб, якія пражываюць у інтэрнаце;

15.6. уносіць у органы самакіравання, упаўнаважаным службовым асобам БДУ прапановы аб паляпшэнні працы інтэрната, арганізацыі вольнага часу пражываючых асоб, развіцці і ўмацаванні матэрыяльнай базы і дабівацца іх рэалізацыі;

15.7. карыстацца паслугамі камеры захоўвання (за рэчы, не прынятыя на захаванне, работнікі інтэрната адказнасці не нясуць).

16. Асобы, якія пражываюць у інтэрнаце, абавязаны:

16.1. выконваць Правілы пражывання ў інтэрнатах для асоб, якія навучаюцца ў БДУ, правілы пажарнай бяспекі, неабходныя меры бяспекі, прафілактыкі траўматызму, першай медыцынскай дапамогі пры ажыццяўленні самастойных заняткаў фізічнай культурай у пакоях для актыўнага адпачынку Студэнцкага гарадка;

16.2. ведаць шляхі эвакуацыі і свае дзеянні пры надзвычайных абставінах;

16.3. выкарыстоўваць памяшканні, абсталяванне і інвентар інтэрната ў адпаведнасці з іх прызначэннем;

16.4. беражліва ставіцца да памяшканняў, месцаў агульнага карыстання, абсталявання і інвентару інтэрната;

16.5. падтрымліваць чысціню ў памяшканнях і месцах агульнага карыстання інтэрната;

16.6. выконваць санітарна-гігіенічныя правілы і нормы;

16.7. не здзяйсняць учынкаў, за якія заканадаўствам прадугледжана адміністратыўная альбо крымінальная адказнасць, учынкаў, якія ствараюць умовы для карупцыі, што абражаюць чалавечую годнасць або якія перашкаджаюць іншым асобам калектыву выконваць свае абавязкі, а таксама ўчынкаў, што наносяць матэрыяльную або маральную шкоду БДУ;

16.8. выконваць агульнапрынятыя нормы паводзін у грамадскіх месцах;

16.9. выконваць графік дзяжурства на вахце, а таксама ўборкі жылых памяшканняў, якія знаходзяцца ў сумесным карыстанні некалькіх асоб, і памяшканняў, што выкарыстоўваюцца па прынцыпе самаабслугоўвання;

16.10. ашчадна расходаваць ваду, электрычную і цеплавую энергію;

16.11. своечасова ўносіць плату за карыстанне жылым памяшканнем, месцамі агульнага карыстання, камунальныя і іншыя паслугі ў інтэрнаце ў адпаведнасці з дамовай найму жылога памяшкання;

16.12. пры выбыцці з інтэрната здаць маёмасць інтэрната загадчыку (службовай асобе, якая яго замяшчае), прывесці ў належны стан пакой і іншыя памяшканні, якія знаходзіліся ў іх карыстанні. Пры няздачы маёмасці альбо яе пашкоджанні, знішчэнні, асоба, якая выбывае з інтэрната, кампенсуе кошт прычыненай страты ў памерах, якія дзейнічаюць на момант кампенсацыі.

17. Асобам, якія пражываюць у інтэрнаце забараняецца:

17.1. самавольна пераабсталёўваць і ажыццяўляць перапланіроўку памяшканняў;

17.2. самавольна перасяляцца з аднаго памяшкання ў іншае;

17.3. самавольна пераносіць маёмасць, якая належыць інтэрнату, з аднаго памяшкання ў іншае;

17.4. наносіць на сцены памяшканняў і ў іншых месцах якія-небудзь надпісы і малюнкі, расклейваць і вывешваць аб'явы, календары, рэпрадукцыі і г.д. без дазволу ўпаўнаважаных службовых асоб БДУ;

17.5. прыносіць, захоўваць і выкарыстоўваць электранагравальныя прыборы для абагравання памяшкання і прыгатавання ежы ў пакоі, блоку;

17.6. трымаць у памяшканні інтэрната катоў, сабак і іншых жывёл;

17.7. курыць (спажываць) тытунёвыя вырабы ў памяшканні інтэрната і на прылеглай тэрыторыі па-за спецыяльнымі месцамі, абсталяванымі для курэння, а таксама прыносіць, захоўваць і выкарыстоўваць кальян у памяшканні інтэрната;

17.8. прыносіць і распіваць алкагольныя, слабаалкагольныя, напоі, якія ўтрымліваюць спірт, і піва, распаўсюджваць, захоўваць і ўжываць наркатычныя сродкі, псіхатропныя, таксічныя і іншыя адурманьваючыя рэчывы, з’яўляцца, знаходзіцца ў стане алкагольнага, наркатычнага або таксічнага ап’янення ў памяшканнях інтэрната і на прылеглай да іх тэрыторыі;

17.9. псаваць маёмасць БДУ або выкарыстоўваць яе не па прызначэнні, здзяйсняць учынкі, што парушаюць чысціню і парадак;

17.10. уключаць гукаўзнаўляльную апаратуру з гучнасцю, якая пераўзыходзіць чутнасць у межах пакоя, і без згоды асоб, якія пражываюць у пакоі;

17.11. пакідаць пабочных асоб у інтэрнаце пасля 23.00 без пісьмовага дазволу загадчыка інтэрната (службовай асобы, якая замяшчае).

18. Асобы, якія пражываюць у інтэрнаце, абавязаны прымаць удзел у грамадска карыснай працы (4 гадзіны ў месяц) з выкананнем правіл аховы працы. Не дапускаецца прыцягненне пражываючых асоб да ўборкі санвузлоў (акрамя санвузлоў у блоках), памяшканняў для душу, пральні і сушкі бялізны.

## Глава 4.
## Заахвочванні і дысцыплінарныя спагнанні

19. За поспехі ў навучальнай, спартыўна-масавай, грамадскай, навуковай, інавацыйнай дзейнасці БДУ ўстанаўліваюцца наступныя меры заахвочвання для асоб, якія пражываюць у інтэрнаце:

а) аб’яўленне падзякі Рэктара БДУ;

б) узнагароджанне Ганаровай граматай БДУ;

в) узнагароджанне Граматай БДУ;

г) узнагароджанне каштоўным падарункам;

д) устанаўленне надбаўкі, прэміраванне;

е) накіраванне падзячнага ліста законным прадстаўнікам навучэнца;

ж) персанальная стыпендыя Вучонага савета БДУ.

20. Заахвочванні, названыя ў абзацах а, б, в, д, ж пункта 19 Правіл пражывання, аб’яўляюцца загадам рэктара БДУ па прадстаўленні дырэкцыі Студэнцкага гарадка з улікам меркавання загадчыка інтэрната (службовай асобы, якая яго замяшчае), рашэнняў органаў студэнцкага самакіравання.

Выпіска з загада аб заахвочванні захоўваецца ў асабовай справе навучэнца.

21. Падставамі да прыцягнення пражываючай асобы да дысцыплінарнай адказнасці з’яўляюцца супрацьпраўнае, вінаватае (наўмыснае або па неасцярожнасці) невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў, ускладзеных на яго актамі жыллёвага заканадаўства, устаноўчымі дакументамі, Правіламі пражывання і іншымі лакальнымі нарматыўнымі

праваўвымі актамі БДУ (дысцыплінарны праступак), у выглядзе супрацьпраўных дзеянняў (бяздзейнасці).

За здзяйсненне навучэнцамі дысцыплінарнага праступка ўсталёўваецца дысцыплінарная адказнасць, якая выяўляецца ў прымяненні да яго мер дысцыплінарнага спагнання.

22. За здзяйсненне дысцыплінарнага праступка да пражываючай асобы могуць быць прыменены наступныя меры дысцыплінарнага спагнання:

а) заўвага;

б) вымова;

у) адлічэнне з БДУ.

23. Адлічэнне як мера дысцыплінарнай адказнасці можа быць прыменена за сістэматычнае (паўторнае на працягу навучальнага года) невыкананне або неналежнае выкананне абавязкаў пражываючай асобай, калі да яе раней прымяняліся меры дысцыплінарнага спагнання.

Адлічэнне як мера дысцыплінарнага спагнання не прымяняецца да навучэнцаў, якія не дасягнулі шаснаццацігадовага ўзросту.

24. Да прымянення дысцыплінарнага спагнання адказны работнік Студэнцкага гарадка БДУ згодна з вызначаным парадкам абавязаны паведаміць аднаму з законных прадстаўнікоў непаўналетняга пражываючага аб магчымасці прыцягнення гэтага непаўналетняга да дысцыплінарнай адказнасці, запатрабаваць пісьмовае тлумачэнне ў пражываючай асобы, якое пражываючая асоба мае права прадставіць на працягу пяці каляндарных дзён. Адмова пражываючай асобы даць такое тлумачэнне павінна быць пацверджана адпаведным актам, які падпісваецца трыма асобамі з ліку работнікаў і (або) навучэнцамі БДУ, што дасягнулі васемнаццацігадовага ўзросту.

25. Падставамі для прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці асоб, што пражываюць у інтэрнаце, могуць служыць дакладныя запіскі дырэкцыі Студэнцкага гарадка (у тым ліку, заснаваныя на рашэнні органаў студэнцкага самакіравання), загадчыка інтэрната (службовай асобы, якая яго замяшчае), асоб, што ажыццяўляюць ахову памяшканняў БДУ.

Падставай для адлічэння з БДУ як меры дысцыплінарнай адказнасці да навучэнца, што пражывае ў інтэрнаце, можа служыць дакладная запіска дырэктара Студэнцкага гарадка і дэкана (намесніка дэкана) факультэта, дырэктара (намесніка дырэктара) інстытута, каледжа, у якім ён навучаецца (у выпадку, калі пражываючая асоба з’яўляецца непаўналетняй – пасля паведамлення адпаведнай камісіі па справах непаўналетніх мясцовага выканаўчага і распарадчага органа). Пры гэтым у выпадку, калі студэнт з’яўляецца членам прафсаюза, адпаведная інфармацыя накіроўваецца ў камітэт пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў.

26. Прымяненне мер дысцыплінарнага спагнання прадугледжваецца Правіламі ўнутранага распарадку для навучэнцаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

27. Рашэнне аб прымяненні дысцыплінарнага спагнання афармляецца загадам рэктара БДУ.

28. Адказны работнік Студэнцкага гарадка БДУ у вызначаным парадку на працягу пяці каляндарных дзён са дня прыцягнення да дысцыплінарнай адказнасці непаўналетняй пражываючай асобы інфармуе аб гэтым аднаго з яго законных прадстаўнікоў, за выключэннем законных прадстаўнікоў замежных грамадзян, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь.

28. Пражываючыя ў інтэрнаце асобы, якім была аб’яўлена вымова, не могуць уваходзіць у склад органаў студэнцкага самакіравання.

29. Навучэнец лічыцца не прыцягнутым да дысцыплінарнай адказнасці, калі на працягу аднаго года з дня прымянення да яго меры дысцыплінарнага спагнання ён не будзе паўторна прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці. Пры гэтым дысцыплінарнае спагнанне пагашаецца аўтаматычна без складання адпаведнага загада.

30. Рэктар БДУ па ўласнай ініцыятыве або па просьбе пражываючай асобы мае права датэрмінова да заканчэння года зняць дысцыплінарнае спагнанне, прыменевае да пражываючай асобы.

31. Датэрміновае зняцце дысцыплінарнага спагнання афармляецца загадам рэктара БДУ. Выпіска з загада аб датэрміновым зняцці дысцыплінарнага спагнання і дакументы, пакладзеныя ў яго абгрунтаванне, захоўваюцца ў асабовай справе навучэнца.

УЗГОДНЕНА
Пратакол пасяджання прэзідыума
камітэта пярвічнай прафсаюзнай
арганізацыі студэнтаў БДУ
ад 23.08.2011 № 7